**УДК [94(476+474.5):339.543]«17»** **DOI 10.52928/2070-1608-2023-66-1-35-39**

# КАМОРЫ-ЭКСПАКГАЎЗЫ Ў СІСТЭМЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ МЫТНАЙ СЛУЖБЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII ст.

***канд. гіст. навук, дац. І.Ф. КІТУРКА***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы)***

*У другой палове XVIII ст. у ВКЛ адбылася рэформа дзяржаўнага апарата, адным з вынікаў якой стала рэарганізацыя мытнай службы і ператварэнне яе ў спецыяльны інстытут у сістэме выканаўчай улады дзяржавы. Мытная служба ВКЛ у гэты перыяд была перабудавана на прынцыпах бюракратыі і стала адной з самых дасканала арганізаваных дзяржаўных структур. Для забеспячэння максімальна поўнага паступлення ў бюджэт грошай, сабраных ад спагнання пошлін ад тавараў, якія перавозіліся праз мяжу, дзяржава шукала аптымальныя шляхі для арганізацыі эфектыўнай працы мытняў, у тым ліку і праз інстытуцыянальныя змены.*

*У артыкуе на падставе вывучэння і абагульнення архіўных матэрыялаў упершыню ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі паказаны роля і значэнне камор-экспакгаўзаў. У прыватнасці, адзначана, што такія адмысловыя пункты мытнага кантролю з'явіліся ў структуры мытнай службы ВКЛ у 1788 г. Яны былі створаны ў гарадах, дзе ажыццяўляўся найбольш актыўны гандаль замежнымі таварамі – Вільні, Гродне, Коўне, Мінску, Брэсце, Слоніме, Пінску, Мазыры, Нясвіжы і Навагрудку. Акрамя правядзення працэдуры мытнага дагляду, ацэнкі тавара і налічэння пошліны, экспакгаўзы дадаткова з'яўляліся месцамі часовага складзіравання і захоўвання тавараў. У даследаванні даецца характарыстыка дзейнасці экспакгаўзаў, адзначаецца іх роля ў пашырэнні і развіцці гандлю на тэрыторыі ВКЛ у другой палове XVIII ст.*

*Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні дзейнасці дзяржаўных інстытутаў ВКЛ у другой палове XVIII ст, пры падрыхтоўцы абагульняючых навуковых прац, вучэбных дапаможнікаў па гісторыі ВКЛ і гісторыі мытнай службы.*

***Ключавыя словы:*** *мытная служба ВКЛ, Скарбавая камісія ВКЛ, мытная пошліна, экспакгаўз, рэпартыцыя, камора, прыкаморак, мытнае справаводства.*

**Уводзіны.** У гісторыі развіцця дзяржаўных структур ВКЛ другая палова XVIII ст. стала часам сапраўднай мадэрнізацыі. У адрозненне ад папярэдняга перыяду, калі, па словах польскага даследчыка А. Загорскага "нешматлікія дзяржаўныя пасады знаходзіліся ў руках некалькіх міністраў, як правіла, пажыццёва, а ваяводствамі і паветамі кіравала шляхта, якая клапацілася ў першую чаргу пра свае інтарэсы і практычна не залежала ад слабой цэнтральнай улады" [1, s. 9–10], адной з галоўных задач у сістэме дзяржаўнага будаўніцтва ў другой палове XVIII ст. стала стварэнне разгалінаванай адміністрацыйнай сістэмы з адпаведным ёй апаратам служачых. Яскравым прыкладам рэалізацыі гэтай задачы з'яўлялася рэарганізацыя мытнай службы ВКЛ.

Вектар развіцця мытнай службы ВКЛ вызначылі рашэнні канвакацыйнага сейма 1764 г., у адпаведнасці з якімі было ліквідавана права спагнання прыватнага мыта, а таксама права яго арэнды і ўведзена адзіная генеральная пошліна [2, s. 78–79]. Гэта патрабавала ўдакладнення і пашырэння мытнай інфраструктуры ВКЛ. Ставілася задача правядзення агульнадзяржаўнага мерапрыемства па больш рацыянальным размяшчэнні мытных пастоў ва ўсіх відах уладанняў з мэтай максімальна поўнага спагнання мытных збораў і прадухілення любых спроб купцоў пазбегнуць выплаты генеральнай пошліны. Вырашыць дадзеную праблему можна было праз стварэнне дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ з адпаведнай інстытуцыянальнай структурай, штатам служачых, нарматыўнаправавым забеспячэннем дзейнасці. Кіравала гэтым працэсам Скарбавая камісія ВКЛ – упершыню створаны спецыяльны дзяржаўны орган, які адказваў за эканамічнае развіццё краіны [2, s. 76].

У адрозненне ад расійскай гістарыяграфіі мытнай службы, у якой, па словах расійскай даследчыцы В.Р. Балкавой: "за стопяцьдзесят гадоў вывучэння гэтага дзяржаўнага феномена былі зроблены значныя поспехі" [3], гісторыя станаўлення дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ даследавана недастаткова [4].

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца вызначэнне месца і ролі ў структуры дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ другой паловы XVIII ст. такога адмысловага пункта мытнага кантролю, як *камора-экспакгаўз*.

**Асноўная частка.** Аналіз гістарыяграфіі і крыніц сведчыць, што ў аснову фарміравання структуры дзяржаўных мытных органаў ВКЛ у другой палове XVIII ст. была пакладзена практыка, якая ўжо існавала ў краіне не адно стагоддзе і апісанне якой прадставіў М.В. Доўнар-Запольскі ў сваёй грунтоўнай працы "Дзяржаўная гаспадарка Вялікага Княства Літоўскага пры Ягелонах" [5]. Прынамсі, ён адзначыў, што для спагнання мытных збораў краіна была падзелена на мытныя акругі. У цэнтры кожнай акругі, як правіла ў буйных гарадах знаходзілася галоўная камора. У розных частках мытнай акругі, на самой граніцы, на "гасцінцах" былі пастаўлены прыкаморкі – аддзяленні галоўнай каморы. Затым, у розных мястэчках і сёлах размяшчаліся пасты, дзе знаходзіліся мытныя стражы [5, с. 534–535]. Пры гэтым гісторык заўважыў, што ў XVI ст. сфарміраваныя раёны мытных акруг (берасцейскае мыта, ковенскае, луцкае, уладзімірскае, навагрудскае, мінскае, смаленскае, кіеўскае, пуціўльскае, бранскае) не заўсёды вытрымліваліся, і перыядычна асобныя каморы ці права на спагнанне асобнага мыта маглі быць "выдзелены" з акругі і перададзены ў арэнду розным асобам. Толькі пасля мытнай рэформы каралевы Боны ў 1536 г. мытныя акругі сталі здавацца на водкуп або ў арэнду цалкам [5, с. 535–536].

У арганізацыі дзейнасці дзяржаўнай мытнай службы ў ВКЛ у другой палове XVIII ст. тэрытарыяльны прынцып таксама быў узяты за аснову. Так, 29 ліпеня 1765 г. на пасяджэнні Скарбавай камісіі ВКЛ "для лепшага кіравання і кантролю над выбіраннем пошлін" тэрыторыя краіны была падзелена на 4 мытныя акругі (Жамойцкую, Беларускую, Рускую і Літоўскую), якія атрымалі назву "*рэпартыцыі"*. На чале рэпартыцый стаялі контррэгістранты [6, l. 31]. Мытныя акругі з'яўляліся найбуйнейшымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі ў мытнай сістэме ВКЛ у другой палове XVIII ст., яны аб'ядноўвалі ўсе сухапутныя мытныя пункты, якія знаходзіліся на іх тэрыторыі: *каморы, прыкаморкі, стражы*. Менавіта па рэпартыцыях вызначалася колькасць мытных пунктаў і мытнікаў, што ў іх працавалі, падсумоўваліся паступленні ад мытных пошлін і плацяжоў, праводзіліся перыядычныя праверкі працы мытных пастоў, ажыццяўлялася кадравая палітыка.

Асноўнымі структурнымі адзінкамі ў сістэме дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ па-ранейшаму заставаліся *мытні* або *каморы (мытныя каморы).* На чале камор стаялі суперінтэнданты (з 1776 г. – інтэнданты). Варта падкрэсліць, што ў даследуемы час у параўнанні з папярэднім перыядам функцыі і роля камор значна пашырыліся. Сплаўныя і сухапутныя каморы сталі ўяўляць сабой не проста спецыяльна вызначаныя і абсталяваныя месцы, дзе праводзілася працэдура мытнага дагляду і мытнага кантролю за перамяшчэннем тавараў, з якіх выбіралася адпаведная пошліна. Яны з'яўляліся элементамі сістэмы дзяржаўнага кіравання і павінны былі забеспячваць правядзенне дзяржаўнай гандлёвай палітыкі на тэрыторыі ВКЛ.

Узровень развіцця гандлю заўсёды з'яўляўся асноўным паказчыкам узроўню развіцця таварна-грашовых адносін у краіне і быў адным з асноўных паказчыкаў яе эканамічнага развіцця ўвогуле [7, с. 21]. Рост цікавасці да гандлёвай тэматыкі яскрава прасочваўся ў другой палове XVIII ст. у праектах прыхільнікаў каралеўскай улады [8, с. 190], у інструкцыях для паслоў на сеймы Рэчы Паспалітай [9], а таксама ў літаратуры эканамічнага характару, якая актыўна выдавалася і распаўсюджвалася ў гэты час на ўсёй тэрыторыі ВКЛ [10].

Для найбольш дасканалай арганізацыі гандлю замежнымі таварамі ў ВКЛ ажыццяўляліся і інстытуцыянальныя змены мытнай структуры. Так, напрыклад, у 1767 г. у структуру дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ дадаткова былі ўведзены *обер-стражы.* Супрацоўнікі гэтых мытных пунктаў выконвалі дзве задачы: яны ажыццяўлялі праверку наяўнасці ў купцоў дакументаў, якія пацвярджалі, што працэдура дагляду і выплаты пошліны пройдзена ў адпаведнасці з зацверджанымі правіламі, і таксама атрымалі права праводзіць мытны дагляд купцоў, якія перавозілі невялікую колькасць тавара – не больш чым на 50 злотых (далей – зл.) [11, l. 12]. Обер-стражы ствараліся пры тых каморах, на мытнай тэрыторыі якіх перамяшчэнне купцоў з таварамі было дастаткова актыўным і меліся разгалінаваныя шляхі, у тым ліку кантрабандныя.

Важным у рэарганізацыі мытнай структуры ВКЛ стаў 1788 г., калі ў адпаведнасці з рашэннем Скарбавай камісіі ВКЛ ад 29 красавіка былі арганізаваны адмысловыя пункты мытнага кантролю, якіх да гэтага часу ніколі не існавала ў дзяржаве, – *каморы-экспакгаўзы* [12, l. 111v–114]. Абвяшчалася, што статус каморы (прыкаморку)-экспакгаўза атрымаюць тыя гарады, дзе ажыццяўляўся найбольш актыўны гандаль замежнымі таварамі, а менавіта Вільня, Гродна, Коўна, Мінск, Брэст, Слонім, Пінск, Мазыр, Нясвіж і Навагрудак. У іх неабходна было за кошт скарба стварыць спецыяльныя мытныя дамы, якія непасрэдна і атрымалі назву "экспакгаўзы" (exрakchauz) – будынкі пры каморах або прыкаморках для часовага складзіравання і захоўвання замежных тавараў, прывезеных на тэрыторыю ВКЛ для продажу, з мэтай іх верыфікацыі і ацэнкі для спагнання мытнай пошліны [12, l. 111v – 113v].

З гэтай мэтай Скарбавая камісія ВКЛ пастанавіла правесці наступныя арганізацыйныя змены: Віленскаму прыкаморку надаваўся статус каморы; у Мінску і Коўне, дзе на той час не было ніякіх мытных пунктаў, загадвалася стварыць каморы, а ў Нясвіжы і Слуцку – прыкаморкі; разам з тым, для Брэсцкай каморы, а таксама для Гродзенскага, Слонімскага, Пінскага і Мазырскага прыкаморкаў дадаваліся функцыі экспакгаўзаў [12, l. 111v – 112].

Прадугледжвалася, што калі купец меў намер прадаваць набыты ім замежны тавар у адным з вышэйпералічаных гарадоў, то на першай пагранічнай каморы ён павінен быў паведаміць пра гэта кіраўніку мытні (інтэнданту). У такім выпадку купец не праходзіў мытны дагляд і не ўносіў пошліну ў пагранічнай каморы, а толькі складаў мытную дэкларацыю – *аўштуг* – з пазначэннем якасці і кошту тавара, месца яго набыцця і горада, дзе будзе гандляваць, а таксама прадстаўляў пацвярджальныя дакументы на тавар – *аўскугі*, якія выдаваліся пры пакупцы тавараў на фабрыках або ў гарадах. Мытнікі, у сваю чаргу, павінны былі ўважліва праверыць цэласнасць пакункаў з таварам і пломбаў, пастаўленых на пагранічнай каморы суседняй дзяржавы, затым запламбіраваць пакункі сваімі знакамі. Замест аўштуга, які заставаўся ў пагранічнай каморы, купец атрымліваў іншы дакумент – *атэстат* (квітанцыю), падпісаны інтэндантам каморы, у якім была наступная інфармацыя: прозвішча купца, змест прадстаўленай дэкладацыі пра асартымент, якасць і кошт тавараў, колькі пакункаў вязе, колькі на кожным з іх пастаўлена пломбаў і ў якіх месцах, калі выехаў з каморы і ў які экспакгаўз накіроўваецца [12, l. 112].

Па прыбыцці на месца купец быў абавязаны адразу з'явіцца ў камору-экспакгаўз для праходжання мытнага дагляду і аплаты пошліны. Мытнікі спачатку правяралі цэласнасць пакункаў і пломбаў, затым вызначалі адпаведнасць увезенай купцом прадукцыі той, што была зафіксавана ў мытным атэстаце, выдадзеным у пагранічнай каморы. Кожны тавар, які супадаў з запісам у квітанцыі, пазначаўся пэўным знакам мытнай рэгістрацыі (пломбамі, штампамі, пячаткамі) такім чынам, каб не нанесці яму шкоды. Для гэтага патрабаваліся спецыяльныя кампетэнцыі, таму ў штаце кожнага экспакгауза была пасада пакмайстра [12, l. 112]. Уменне правільна распакоўваць і ўпакоўваць тавары, а таксама прафесійна з вялікай ашчаднасцю пазначаць іх адпаведнымі знакамі ацэньвалася дастаткова высока. Пра гэта сведчыць і памер жалавання пакмайстраў, якое ў другой палове XVIII ст.

складала больш чым 1 000 зл. у год. Гэта было значна вышэй, чым у мытных пісараў, якія за сваю службу атрымлівалі ад 500 да 800 зл. у год, і супаставіма з жалаваннем інтэндантаў некаторых сухапутных камор (ад 800 да 1 600 зл. у год) [13, с. 65].

Скарбавая камісія ВКЛ сваім распараджэннем рэгламентавала парадак дзеянняў пакмайстраў па нанясенні адпаведных мытных знакаў на розныя тавары. Так, падчас мытнага дагляду ў экспакгаўзе на тканінах і любым іншым тавары, які вымяраўся ў локцях, пакмайстары павінны былі ставіць пломбы з двух канцоў рулона. На ўсіх таварах з бавоўны, шоўку, скур і да т.п., якія лічыліся ў штуках, павінны былі акуратна паставіць штамп іншага колеру, чым сам тавар. На мэблі, каб не пашкодзіць яе вонкавы выгляд, прадпісвалася ставіць пячаткі наверсе. Срэбныя галантарэйныя тавары неабходна было пазначаць скарбавай пячаткай, нанесенай на абодва канцы ніткі, працягнутай праз нейкі элемент такога тавару [12, l. 112v]. Спецыяльныя знакі для пламбіравання, штампавання і апячатвання тавараў рознага асартыменту, якасці і памераў інтэнданты камор-экспакгаўзаў былі абавязаны атрымаць у Скарбавай камісіі ВКЛ. За кожны пастаўлены на тавары мытны знак купец павінен быў заплаціць 1 срэбны грош [12, l. 113v].

Пасля праходжання працэдуры мытнай рэгістрацыі тавараў і аплаты налічанай пошліны купец замест атэстату, які неабходна было пакінуць для справаздачы ў экспакгаўзе, атрымліваў так званы *рэверс* – копію мытнай квітанцыі з подпісам інтэнданта або пісара экспакгаўза і адбіткам скарбавай пячаткі. Толькі пасля гэтага купец меў права прадаваць прывезены тавар у горадзе. Пры гэтым у выпадку, калі нават праз нейкі час у краме рэвізоры выяўлялі замежны тавар, не пазначаны спецыяльным знакам мытнай рэгістрацыі, то ён падлягаў канфіскацыі, а ўласніку дадаткова налічваўся штраф.

Усе вышэйпералічаныя ўмовы неабходна было дакладна выконваць, бо калі высвятлялася, што купец патрапіў у горад без дакументаў з пагранічнай каморы ці пры верыфікацыі ўскрываліся факты парушэнняў (тавар не адпавядаў па асартыменце, якасці ці кошту той інфармацыі, якая была зафіксавана ў атэстаце), то ўвесь тавар цалкам затрымліваўся ў экспакгаўзе. Купец быў абавязаны даць пісьмовае тлумачэнне такому здарэнню і чакаць рашэння Скарбавай камісіі ВКЛ [12, l. 113].

У распараджэнні Скарбавай камісіі ВКЛ акцэнтавалася ўвага на тым, што нават калі купец прайшоў мытны дагляд і заплаціў пошліну ў пагранічнай каморы, але меў намер гандляваць у гарадах, дзе былі экспакгаўзы, ён усё роўна быў абавязаны ехаць у гэты пункт мытнага кантролю для верыфікацыі тавараў і пазначэння іх адпаведнымі мытнымі знакамі [12, l. 113v].

Асаблівыя льготы прадстаўляліся мясцовым гандлярам з добрай рэпутацыяй. Ім Скарбавая камісія ВКЛ магла выдаваць спецыяльны дакумент – *рэміс*, згодна з якім купец не ўносіў пошліну ў пагранічнай каморы, а толькі праходзіў працэдуру пламбіравання пакункаў з таварамі і накіроўваўся для праходжання мытнага дагляду і аплаты пошліны ў камору-экспакгаўз. Каб атрымаць такую льготу купец павінен быў стала пражываць у адным з гарадоў, дзе знаходзілася камора-экспакгаўз, і мець адпаведны дазвол магістрата (пасведчанне) на ажыццяўленне гандалю ў ім. Менавіта на падставе такога пасведчання Скарбавая камісія ВКЛ магла выдаць рэміс на тэрмін ад 1 да 3 гадоў [12, l. 113v]. Кіраўнік пагранічнай каморы павінен быў праз ганцоў або поштай паведаміць у камору-экспакгаўз, што купец з правам рэміса перасёк мяжу, і ў пісьмовай форме прадставіць спецыфікацыю яго тавараў. У такім выпадку гандляр меў, як мінімум, дзве перавагі: па-першае, распакоўваць тавары ён быў абавязаны толькі адзін раз і ў тым горадзе, дзе жыў сам; па-другое, пры адсутнасці неабходнай сумы грошай для аплаты пошліны ён на працягу нейкага часу за невялікую плату мог захоўваць свой тавар у экспакгаўзе і толькі потым прайсці мытны дагляд і аплаціць пошліну [14, s. 151].

Відавочна, што для правядзення такой працэдуры мытнага дагляду ў экспакгаўзе неабходна было стварыць адпаведныя ўмовы. Варта падкрэсліць, што ў час найбольш значных кірмашоў у канкрэтным горадзе магла ўтварыцца чарга з купцоў, якія павінны былі для атрымання права правядзення гандлю прайсці ўсе мытныя працэдуры і заплаціць пошліну. У такіх абставінах мытнікі экспакгаўза былі абавязаны першапачаткова прыняць тавар на склад для часовага захоўвання, покуль не падыйдзе чарга купца для мытнага афармлення, паколькі яму пад пагрозай канфіскацыі катэгарычна забаранялася ехаць з таварам дадому, мінуючы экспакгаўз. Таму распараджэннем Скарбавай камісіі ВКЛ прадпісвалася падабраць у вызначаных гарадах для размяшчэння экспакгаўзаў зручныя месцы з добрым уездам і дзядзінцам, наяўнасцю вазоўняў і свіранаў, а таксама прадугледзець "надзейную ахову ад пажараў, злодзеяў і іншых непрыемнасцей" [12, l. 112v].

Інфармацыю пра такія новаўвядзенні неабходна было распаўсюдзіць ва ўсіх пагранічных каморах для таго, каб азнаёміць з ёй як мытных служачых, так і купцоў, якія гандлявалі замежнымі таварамі на тэрыторыі ВКЛ. Неабходна падкрэсліць, што ў каморах-экспакгаўзах не праводзілася працэдура мытнага дагляду і налічэння пошліны з мясцовых тавараў, якія вывозіліся за мяжу. Рашэнне аб арганізацыі экспакгаўзаў было спробай паставіць пад мытны кантроль усю тэрыторыю ВКЛ з мэтай узмацнення барацьбы з кантрабандай, паляпшэння ўліку менавіта замежных тавараў і, галоўнае, для павелічэння паступленняў ад мытных пошлін у скарб.

Аднак стварэнне сістэмы спецыяльных будынкаў для размяшчэння экспакгаўзаў аказалася не зусім простай справай. Спецыяльна такія склады не будаваліся, таму неабходна было не толькі падабраць сярод існуючых у горадзе будынкаў такія, якія адпавядалі б патрабаванням часовага складзіравання і захоўвання тавараў – з добрым заездам і дзядзінцам, вазоўнямі і свіранамі, але і дамовіцца з іх уладальнікамі адносна арэнды [12, l. 114v]. Такое заданне ў адпаведнасці з распараджэннем Скарбавай камісіі ВКЛ атрымалі віленскі, ковенскі, мінскі і

навагрудскі экзактары[1], а таксама пісары Гродзенскага, Слонімскага, Пінскага і Мазырскага прыкаморкаў [12, l. 115–115v]. У мытных пратаколах удалося знайсці толькі два запісы аб тым, што дамы для размяшчэння экспакгаўзаў былі вызначаны. Так, 17 лістапада 1788 г. Скарбавая камісія ВКЛ зацвердзіла кантракт, заключаны суперінтэндантам Літоўскай рэпартыцыі Гілярыем Лаўцэвічам на арэнду будынкаў для размяшчэння экспакгаўза ў Гродне за 1 200 зл. у год [14, l. 42], а 18 лістапада 1788 г. – кантракт, заключаны мінскім экзактарам Комарам на арэнду адпаведнага будынку ў Мінску за 500 зл. у год [14, l. 45v].

Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай, калі краіна аказалася ў стане палітычнай і фінансавай нестабільнасці, экспакгаўзы з дазволу Скарбавай камісіі ВКЛ пачалі аддавацца ў арэнду розным асобам, на якіх і ўскладваўся абавязак па іх утрыманні і бесперапынным функцыянаванні. Разам з тым, вывучэнне і абагульненне розных дакументаў Скарбавай камісіі ВКЛ дазваляе сцвярджаць, што экспакгаўзы функцыянавалі ў структуры мытнай службы ВКЛ да спынення яе дзейнасці ў выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 г. [15, s. 150–151; 16, l. 3v].

**Заключэнне**. Падсумоўваючы вышэйсказанае, неабходна адзначыць, што другая палова XVIII ст. для ВКЛ стала важным этапам у сферы дзяржаўнага рэфармавання ў галіне эканомікі. Сваю ролю ў гэтым працэсе адыграла і стварэнне экспакгаўзаў. З’яўленне ў ВКЛ у 1788 г. спецыяльных складоў абавязковай верыфікацыі замежных тавараў і маркіроўкі іх спецыяльнымі скарбавымі знакамі, разам з увядзеннем забароны на продаж рэчаў, якія не мелі такіх знакаў, безумоўна, стала новым этапам у развіцці мытнай справы ВКЛ. Функцыя экспакгаўзаў не была рэалізавана ў ВКЛ у поўнай меры, але сама ідэя, якая ўзнікла ў апошняй чвэрці XVIII ст. аб стварэнні ў буйных гарадах месцаў для часовага складзіравання, захоўвання і маркіроўкі тавараў і магчымасці праводзіць у іх мытны дагляд і збіраць пошліну, стала ў далейшым неад’емнай часткай у структуры дзяржаўнай мытнай службы.

## ЛІТАРАТУРА


1. Zahorski A. Centralne instytucje polityczne w Polsce w dobie rozbiorów. – Warszawa, 1959. – 283 s.
2. Volumina legum. – Petersburg: Nakładem i drukiem Jozafata Ohryzki, 1860. – T. VII. – 415 s.
3. Балковая В.Г. Таможенная служба в системе управления Российского государства (XVI–XVIII вв.): историко-правовой аспект. Диссерт. на соиск. уч. ст. докт. юрид. наук. URL: https://www.dissercat.com/content/tamozhennaya-sluzhba-v-sisteme-upravleniya-rossiiskogo-gosudarstva-xvi-xviii-vv-istoriko-pra (дата обращения 05.11.2020).
4. Кітурка І.Ф. Стварэнне і развіццё дзяржаўнай мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст.: гістрыяграфія пытання // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя Гуманітарныя навукі (гісторыя, філасофія, філалогія) – 2021. – № 2 (58). – С. 13–23.
5. Довнар-Запольский М.В. Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах. – Т. І. – Киев: Тип. Имп. св. Владимира и издательское дело Н.Т. Корчак-Новицкого, 1901. – VIII, 807, CXII с.
6. Lietuvos Vastybes Istorijos Archyvas (LVIA) – Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. – F. 11. Скарбавая камісія ВКЛ (1509–1797 гг.). – Ap. 1. – Bib. 111. Эканамічныя пратаколы ўказаў і распараджэнняў (1765–1766 гг.).
7. Голубеў В.Ф. Гандаль у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVIII стст.: ступень вывучанасці, формы, прынцыпы арганізацыі, асноўныя накірункі ў вывучэнні (пастаноўка праблемы) // Гісторыя гандлю на тэрыторыі Беларусі: зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад.: А.А. Скеп’ян ; рэдкал.: А.А. Каваленя і інш. – Мінск: Беларуская навука, 2016. – С. 21–32.
8. Pilarczyk P.M. Komisja Skarbu Wielkiego Księstwa Litewskiego wobec zagadnień handłowych // Гісторыя гандлю на тэрыторыі Беларусі: зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад.: А.А. Скеп’ян ; рэдкал.: А.А. Каваленя і інш. – Мінск: Беларуская навука, 2016. – С. 189–201.
9. Pilarczyk P.M. Instrukcje dla litewskich komisarzy skarbowych delegowanych na sejmy (1780–1790) // Krakowskie studia z historii Państwa i Prawa. – 2020. – T. 13. – Nr. 2. – S. 235–255.
10. Кітурка І. Эканамічная літаратура другой паловы XVIII ст. аб неабходнасці і шляхах рэфармавання сельскай гаспадаркі Вялікага княства Літоўскага //Silva rerum nova: Штудыі ў гонар 70-годдзя Георгія Я. Галенчанкі. – Вільня-Мінск: AIDAI – ATHENAEUM, 2009. – С. 162–168.
11. LVIA. – F. 11. – Ap. 2. – Bib. 88. Устава і інструкцыі Камісіі па арганізацыі мытняў у ВКЛ (1767 г.).
12. LVIA. – F. 11. – Ap. 1. – Bib. 238. Мытныя пратаколы (1786–1788 гг.).
13. Китурко И.Ф. Денежное обеспечение служащих государственной таможенной службы ВКЛ во второй половине XVIII в. // Вестник Брянского государственного университета. Сер. Исторические науки. – 2022. – № 2– С. 63–71.
14. LVIA. – F. 11. – Ap. 1. – Bib. 239. Мытныя пратаколы (1788–1790 гг.).
15. Gordziejew J. Materiały źródłowe do dziejów Wielkiego Księstwa Litewskiego. Cz. 2: Z Zagadnień sksrbowości w dobie stanisławowskiej // Rocznik Biblioteki Naukowej PAU i PAN w Krakowie. – 2004. – S. 127–166.
16. LVIA. – F. 11. – Ap. 1. – Bib. 131. Пратаколы Скарбавага дэпартамента (1795 г.).


*Паступіў 15.12.2022*

[1] Экзактар – у другой палове XVIII ст. у ВКЛ кіраўнік падаткавай акругі – экзакцыі па выбіранні падаткаў ад вырабу і продажу алкагольных напояў (чопавага і шэляжнага).

# КОМОРЫ-ЭКСПАКГАУЗЫ В СИСТЕМЕ ГОСУДАРСТВЕННОЙ ТАМОЖЕННОЙ СЛУЖБЫ ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XVIII в.

***И.Ф. КИТУРКО***
***(Гродненский государственнный университет имени Янки Купалы)***

*Во второй половине XVIII в. в ВКЛ проводилась реформа государственного аппарата, одним из результатов которой стала реорганизация таможенной службы и преобразование её в специальный институ в системе испольнительной власти государства. Таможенная служба ВКЛ в этот период была перестроена по принципам бюрократизма и стала одной из наиболее грамотно организованных государственных структур. Для обеспечения максимально полного поступления в бюджет денег, собраных от взимания пошлин на товары, перевозимые через границу, государство искало оптимальные пути для организации эффективной работы таможень, в том числе и посредством институциональных изменений.*

*В статье на основе изучения и обобщения архивных материалов впервые в отечественной и зарубежной историографии показаны роль и значение комор-экспакгаузов. В частности, отмечено, что такие специальные пункты таможенного контроля появились в структуре таможенной службы ВКЛ в 1788 г. Они были созданы в городах, где осуществлялась наиболее активная торговля зарубежными товарами – в Вильно, Гродно, Ковно, Минске, Бресте, Слониме, Пинске, Мозыре, Несвиже и Новогрудке. Кроме проведения процедуры таможенного досмотра, оценки товара и начисления пошлины, экспакгаузы дополнительно являлись местом временного складирования и хранения товаров. В исследовании дается характеристика деятельности экспакгаузов, отмечается их роль в расширении и развитии торговли на территотии ВКЛ во второй половине XVIII в.*

*Результаты исследования могут быть использованы при изучении деятельности государственных институтов ВКЛ во второй половине XVIII в., при подготовке обобщающих научных работ, учебных пособий по истории ВКЛ и истории таможенной службы.*

***Ключевые слова:*** *таможенная служба ВКЛ, Скарбовая комиссия ВКЛ, экспакгауз, репортиция, комора, прикоморок, таможенное делопроизводство.*

# KOMORAS-EXPACKHAUSES IN THE SYSTEM OF STATE CUSTOMS SERVICE OF GREAT DUCHY OF LITHUANIA IN LATTER HALF OF XVIII CENTURY

***I. KITURKA***
***(Yanka Kupala State University of Grodno)***

*In the latter half of the XVII century, there was a reform of the state apparatus in the GDL; one of the results of this reform was the reorganization of the customs service and its transformation into a special institution in the system of the executive power of the State. During this period, the customs service of the GDL was rebuilt on the principles of bureaucracy and became one of the most perfectly organized state structures. In order to ensure that the money collected from duties on goods transported across the border is fully received by the budget, the state looked for optimal ways to organize the effective work of customs, including those by institutional changes.*

*Basing on the study and generalisation of archival materials, the article shows the role and significance of komoras-expackhouses for the first time in domestic and foreign historiography. In particular, it was noted that these special customs checkpoints appeared in the structure of the customs service of the GDL in 1788. They were organised in the cities where the most active trade in foreign goods was carried out - in Vilnius, Grodno, Kaunas, Minsk, Brest, Slonim, Pinsk, Mozyr, Niesvizh and Novogrudok. In addition to carrying out the procedure of customs inspection, valuation of goods and calculation of duty, expackhouses were also places of temporary warehousing and storage of goods. The study describes the activity of expackhouses, notes their role in the expansion and development of trade in the territory of the GDP in the latter half of the XVIII century.*

*The results of the research can be used when studying the activities of the state institutions of the GDL in the latter half of the XVIII century, preparing synthetical scientific works, textbooks on the history of the GDL and the history of the customs service.*

***Keywords:*** *customs service of GDL, Skarbovaya Commission of GDL, customs duty, expackhouse, repartition, komora, prykomorok, customs record-keeping.*